

# «КАБ НАШЫ ПРАФСАЮЗЫ БЫЛІ МАГУТНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ»

**Прымаючы з дакладам старшыню ФПБ, Прэзідэнт падкрэсліў важную ролю самай масавай арганізацыі краіны ў падтрыманні стабільнасці грамадства**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЛІПЕНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 136 (30524)

# КАБ МІНСК НЕ ПЕРАТВАРАЎСЯ Ў ВЕНЕЦЫЮ

**Што для гэтага робіцца сталічнымі службамі**

Летнія трапічныя ліўні становяцца галаўным болем для мінчан і гарадскіх улад: падтопленыя вуліцы і магазіны, плаваючыя машыны, спынены на некалькі гадзін грамадскі транспарт... Сталічныя ўлады каторы год імкнуцца вырашыць праблему гарадскіх патопаў. Год таму будаўніцтвам аб'ектаў ліўневай каналізацыі занялося прадпрыемства «Гардарбуд». Ужо сёлета ў эксплуатацыю будзе здадзены адзін з найбольш буйных праектаў — ліўневы калектар «Яркава». І, як абяцаюць спецыялісты, з паступовай рэалізацыяй усёй праграмы, вады на сталічных вуліцах падчас ліўняў будзе ўсё менш і менш.







СТАР. 10



УРАДЖАЙ 2025: НЕ ГОРШЫ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ 6–7



ПРАГА ВЕДАЎ ВА ЎЗРОСЦЕ 8–9



+TV ПРАГРАМА

«КАМАНДЗІР ШЧАСЛІВАГА ШЧУПАКА»

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

СЕЗОННЫ КЛОПАТ

## ВУЧНЁЎСКІ «СПАЖЫВЕЦКІ КОШЫК»

**Стартавалі школьныя кірмашы. Даведаліся ў спецыялістаў пра асартымент і цэны**

Праз паўтара месяца пачнецца новы навучальны год — а гэта значыць, што прыйшоў час закупляцца ўсім неабходным для школы. У рэгіёнах і ў сталіцы ўжо разгарнуўся маштабны гандаль! Школьныя кірмашы актыўна пашыраюць асартымент тавараў да новага навучальнага года. Акрамя таго, у гандлёвых аб'ектах афармляюцца спецыяльныя «куткі» школьніка і першакласніка. «Звязда» разабралася, як будзе ажыццяўляцца гандаль у сёлетнюю гарачую пару, а таксама даведалася, колькі ў сярэднім будзе каштаваць апрануць дзіця ў школу.

СТАР. 8–9



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ISSN 1990 — 763X

# «КАБ НАШЫ ПРАФСАЮЗЫ

## Прымаючы з дакладам старшыню ФПБ, Прэзідэнт падкрэсліў важную ролю

Беларускі лідар неаднаразова падкрэсліваў вялікую ролю чалавека працы ў нашай дзяржаве. Ён пастаянна арыентуе адказных асоб на стварэнне камфортных умоў для працы людзей. Адказваюць за гэта ў тым ліку і прафсаюзы, чыю дзейнасць кіраўнік дзяржавы не выпускае з поля зроку.



Фота БелТА.

У чацвер Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню Федэрацыі прафсаюзаў нашай краіны Юрыя Сянько. Перш за ўсё кіраўнік дзяржавы пацікавіўся сітуацыяй у прафсаюзах, «свежым поглядам» новага кіраўніка, у якога аднак было дастаткова часу, каб увайсці ў курс справы. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, з чым звязана гэтае пытанне: «Я вельмі хацеў бы, каб прафсаюзы нашы былі магутнай арганізацыяй. Яны і цяпер з'яўляюцца, напэўна, самай магутнай партыйнай арганізацыяй і каціруюцца ў арганізацыйным плане вышэй за любую партыю, якая ў нас існуе».

Расказаць пра сітуацыю ў прафсаюзах Аляксандр Лукашэнка папрасіў без прыўкрашвання. «Толькі тое, якія вы адчуваеце недахопы. Ты ж чалавек збоку, можна сказаць. І я гэта ўлічваў і падтрымліваў цябе, калі ты пагадзіўся вылучыць сваю кандыдатуру для выбрання старшынёй, разумеючы, што свежы чалавек прыйдзе, як у народзе кажуць, незамыленым вокам паглядзіць на сітуацыю ў прафсаюзах», — адзначыў ён.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што не абыходзіць увагай прафсаюзы, у тым ліку калі гаворка ідзе аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне, таму што, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, прафсаюзы (як гэта і павінна быць) «заземлены» на працоўныя калектывы, на людзей. Прэзідэнт падзякаваў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за актыўны ўдзел у перадвыбарнай кампаніі і вялікую дапамогу ўсім тым, хто займаўся выбарамі.

## Даслоўна

У размове з журналістамі пасля даклада ў Прэзідэнта Юрый СЯНЬКО падзяліўся падрабязнасцямі.

### ІНСТЫТУТ НАСТАЎНІЦТВА ЗАМАЦУЮЦЬ У ПРАЦОЎНЫМ КОДЭКСЕ

Старшыня ФПБ адзначыў, што сёння прафсаюзы вядуць работу па ўнясенні змяненняў у Працоўны кодэкс, шэраг нормаў прапрацоўваецца. «У тым ліку я праінфармаваў кіраўніка дзяржавы, што прафсаюзамі была ўнесена прапанова аб замацаванні інстытута настаўніцтва ў Працоўны кодэкс. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў, што важна замацаваць гэты інстытут», — распавёў ён.

### ПРАФСАЮЗЫ НА ЖНІВЕ

Старшыня ФПБ адзначыў, што прафсаюзы традыцыйна ўдзельнічаюць ва ўборачнай кампаніі, на гэтае пытанне таксама звярнуў увагу і Прэзідэнт. Прафсаюзы займаюцца арганізацыяй гарачага харчавання, забеспячэння работнікаў усім неабходным, заахвочваннем перадавікоў вытворчасці. «За 2024 год ва ўборачную кампанію прафсаюзы заахвоцілі 8900 работнікаў — ад кухараў да камбайнераў — усіх, хто так ці інакш быў задзейнічаны ў жніве. Мы пастараліся ахапіць усіх», — удакладніў Юрый Сянько.

### ЗВЫШУРОЧНЫЯ РАБОТЫ СТАНОВЯЦЦА ПАПУЛЯРНЫМІ

Журналісты звярнулі ўвагу на пытанне звышурочных работ. Старшыня ФПБ нагадаў, што ў 2024 годзе Прэзідэнт падпісаў Указ № 105 «Аб звышурочнай рабоце і рабоце ў выхадныя дні ў прамысловых арганізацыях». Дакумент рэгламентуе магчымасць дадаткова прыцягваць работнікаў з іх згоды. Па словах Юрыя Сянько, гэта выгадна працаўніку, які за звышурочную работу атрымлівае дадатковую плату, і зручна наймальніку, якому не трэба дадаткова шукаць спецыяліста. «Летась больш за 160 арганізацый скарысталіся магчымасцю адпаведнага ўказа і прыцягвалі работнікаў звышурочна або ў выхадныя дні. Такая магчымасць не менш запатрабаваная і сёлета. У цэлым, у Беларусі каля 16 тысяч работнікаў прыцягваліся да звышурочных работ, — прывёў лічбы Юрый Сянько. — Прафсаюзы разам з наймальнікамі аналізуюць такую работу. Мы ўжо маем дастаткова нядрэнны аналіз. Таму з новымі арганізацыямі, якія звяртаюцца з пытаннямі дадатковага прыцягнення работнікаў, мы абмяркоўваем стварэнне ўмоў для таго, каб чалавек мог звышурочна працаваць і паўнавартасна адпачываць».

### ВЫПЛАТА ЗАРПЛАТЫ ПАД КАНТРОЛЕМ

Журналісты пацікавіліся, як вырашаецца праблема нясвоечасовай выплаты заробкаў. Па словах старшыні ФПБ, калі чатыры гады таму ў краіне было зафіксавана каля 900 выпадкаў нясвоечасовай выплаты заробкаў, то за шэсць месяцаў бягучага года — усяго 99. «Калі заробак не выплачваецца своечасова, то прафсаюзы і наймальнікі разумеюць, што трэба тэрмінова прымаць меры. Мы трымаем гэтае пытанне на кантролі. І мы працягнем кантраляваць гэтае пытанне», — адзначыў ён.

«Я падзякаваў кіраўніку дзяржавы за тое, што мы маем магчымасць не на барыкадах, а за сталом перагавораў вырашаць усе пытанні. Гэта вельмі важна — хутка, кампетэнтна, выразна вырашыць усе пытанні і прыняць рашэнне, якое будзе важна як для прадпрыемства, так і для работнікаў», — дадаў Юрый Сянько.

### АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З МАП І МЫТНАЙ СЛУЖБЕ

Сярод пытанняў, вынесеных на даклад у Прэзідэнта, была і міжнародная дзейнасць прафсаюзаў. Журналісты пацікавіліся, як у ФПБ складваюцца адносіны з Міжнароднай арганізацыяй працы. Адказваючы на гэтае пытанне, Юрый Сянько адзначыў, што МАП — адна з пляцовак, на якой ФПБ разам з урадам і наймальнікамі прадстаўляе інтарэсы працоўных. Паводле яго слоў, гэта добрая пляцоўка, але цяпер моцна палітызаваная. «Але нават у перыяд жорсткай палітызацыі і ціску на Рэспубліку Беларусь мы маем магчымасць адкрыта выступаць, распавядаць пра дасягненні нашай краіны, аб працы прафсаюзнага руху ў нашай краіне, аб абароне правоў працоўных. Я меў магчымасць выступіць на дзвюх вялікіх пляцоўках, дзе дастаткова дэталёва выклаў пазіцыю Рэспублікі Беларусь, прафсаюзнага руху. І я перакананы, што мы былі пачутыя», — распавёў ён.

Гаворачы аб даручэнні Прэзідэнта «прыглядаць» за работай мытнай службы, Юрый Сянько расказаў, што ў найбліжэйшы час сумесна з цяперашнім кіраўніцтвам мытнага камітэта будуць выпрацаваны падыходы да ацэнкі работы мытнай службы.

# БЫЛІ МАГУТНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ»

## самай масавай арганізацыі краіны ў падтрыманні стабільнасці грамадства

**«Я вельмі разлічваю, што прафсаюзы ў нас будуць арганізаваны магутнай базай для таго, каб падтрымліваць стабільнасць у нашым грамадстве», — падкрэсліў беларускі лідар.**

Ён абазначыў шэраг пытанняў для абмеркавання са старшынёй Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Сярод іх — звышурочныя работы, уборачная кампанія, міжнародная дзейнасць. Асобна Прэзідэнт звярнуў увагу на зямельныя ўчасткі.

**«У нас тэма па краіне ў цэлым існавала і існуе — для таго, каб замацаваць за тымі ці іншымі арганізацыямі зямельныя ўчасткі, якімі яны карыстаюцца «спрадвеку», як у народзе кажуць. Патрэбны праваўстанаўляльныя дакументы», — адзначыў ён.**

Аляксандр Лукашэнка пазначыў яшчэ адно пытанне — дзяржаўнае. Паколькі Юрый Сянько раней шмат гадоў працаваў у мытнай службе, узначальваў Дзяржаўны мытны камітэт, кіраўнік дзяржавы пацікавіўся яго меркаваннем аб рабоце мытнай службы ў краіне. «Усё ж генералаў жа былых не бывае, таму вы так адным вокам пазірайце на тое, як працуе ваша ведамства, у якім вы выраслі», — заўважыў ён.

**У сваю чаргу Юрый Сянько нагадаў, што роўна 30 гадоў таму — 15 ліпеня 1995 года кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ «Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь». Старшыня ФПБ падкрэсліў, што гэты ўказ даў добры імпульс да таго, каб урад, прафсаюзы, наймальнікі разам за сталом перагавораў вырашалі пытанні.**

Прэзідэнт удакладніў, ці дзейнічае гэта схема дагэтуль.

«Абсалютна добра дзейнічае. Сёння вылілася ў выдатныя статыстычныя даныя, змены ў нарматыўна-прававых актах. Дапусцім, у Працоўным кодэксе сёння дзейнічае 105 нормаў, якія адсылаюць да калектыўных дагавораў, якія падпісваюць прафсаюзы разам з наймальнікамі.

**Заканадаўства напоўнена нормамі, якія так ці інакш ідуць у развіццё сацыяльнага партнёрства і ў развіццё гэтага ўказа», — адказаў Юрый Сянько.**

Ён падкрэсліў, што пры такім падыходзе ўсе пытанні вырашаюцца канструктыўна з улікам усіх нюансаў і захаваннем агульных інтарэсаў. «Гэта нармальная работа прадпрыемстваў — без спыненняў, без страт. І для работніка — (работа. — **«Зв.»**) якая стымулюе ўсе нюансы, звязаныя з яго жаданнем працаваць, берагчы сябе для гэтага рабочага месца», — дадаў старшыня ФПБ.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ФЕДЭРАЦЫЯ ПРАФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ ГЭТА:

**самая масавая грамадская арганізацыя краіны, якая аб'ядноўвае каля 4 000 000 чалавек**

## 15 членскіх арганізацый

- Беларускі прафесійны саюз работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў гандлю, спажывецкай кааперацыі і прадпрымальніцтва
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў хімічнай, горнай і нафтавай галін прамысловасці
- Беларускі прафесійны саюз банкаўскіх і фінансавых работнікаў
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў аграпрамысловага комплексу
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў аховы здароўя
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў лесу і прыродакарыстання
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі і сферы абслугоўвання
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў энергетыкі, газавай і паліўнай прамысловасці
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў транспарту і камунікацый
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў сувязі
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў адукацыі і навукі
- Беларускі прафесійны саюз работнікаў галін прамысловасці «БЕЛПРАФМАШ»

## 7 арганізацыйных структур

- Брэсцкае абласное аб'яднанне прафсаюзаў
- Гродзенскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў
- Мінскае гарадское аб'яднанне прафсаюзаў
- Віцебскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў
- Мінскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў
- Гомельскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў
- Магілёўскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў

### АСНОЎНАЯ МЭТА ДЗЕЙНАСЦІ

• абарона працоўных правоў і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў работнікаў

### АСНОЎНЫ ПРЫНЦЫП ДЗЕЙНАСЦІ

• сацыяльны дыялог. Яшчэ ў 1995 годзе быў падпісаны Указ Прэзідэнта «Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь», у якім замацавана, што развіццё сістэмы сацыяльнага партнёрства — адна з галоўных задач дзяржавы. На аснове гэтага дакумента створаны і дзейнічае Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях.

### АСНОЎНЫЯ КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ

- удзел ва ўдасканаленні заканадаўства;
- грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы;
- прававая дапамога работнікам;
- кантроль за выкананнем заканадаўства аб ахове працы;
- арганізацыя адпачынку і аздараўлення працоўных і іх дзяцей;
- падтрымка работнікаў з дзецьмі;
- захаванне гістарычнай памяці.

БАНК РЕШЕНИЕ

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС 30 июня 2025 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.06.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 25 689 | 30 091 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 28 191 | 19 188 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 28 568 | 43 274 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 27 328 | 18 725 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 234 455 | 213 472 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 454 | 454 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 24 106 | 23 326 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 472 | 515 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 258 | 284 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 5 705 | 6 434 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 375 226 | 355 763 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 15 143 | 28 953 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 261 510 | 228 106 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 12 744 | 14 317 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3 811 | 5 500 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 293 208 | 276 876 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 35 988 | 35 988 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 9 568 | 8 225 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 12 735 | 13 367 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 23 727 | 21 307 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 82 018 | 78 887 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 375 226 | 355 763 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за июнь 2025 г.

Наименование банка: ЗАО «Банк «Решение»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.06.2025 | 30.06.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 19 143 | 14 534 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 8 859 | 5 047 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10 284 | 9 487 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 12 343 | 9 707 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 031 | 3 263 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 8 312 | 6 444 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (414) | (718) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 3 583 | 6 229 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 296 | 954 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 365 | 666 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 14 496 | 13 112 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 215 | 93 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 123 | 7 949 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 360 | 2 064 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 763 | 5 885 |

Председатель Правления С.Д. Будников

Главный бухгалтер Т.В. Дорофей

Дата подписания: 2 июля 2025 г.

ЗАО «Банк «Решение», УНП 100789114. Лиц. № 14 от 16.12.2024 НБ РБ


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# АД РАМОНТУ ДАРОГ ДА РАЗВІЦЦЯ КАМАНДНЫХ ВІДАЎ СПОРТУ

## З чым ішлі людзі на прыём да сенатараў у Гомельскай вобласці

**Правядзенне адзінага дня прыёму ў рэгіёнах стала ўжо добрай традыцыяй і свайго роду візітнай карткай Савета Рэспублікі, які з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. У вызначаны дзень сенатары працуюць ва ўсіх без выключэння раёнах вобласці, і жыхары могуць на месцы агучыць прадстаўніку вышэйшай заканадаўчай улады праблемы, якія хвалююць, задаць пытанні, якія цікавяць, або падзяліцца ўласнай ідэяй ці ініцыятывай. Учора такі паўсюдны дыялог з людзьмі члены Савета Рэспублікі праводзілі ва ўсіх райцэнтрах Гомельскай вобласці.**

Жыхары рэгіёна актыўна выкарыстоўвалі магчымасць данесці свае праблемы. Звароты паступалі самага рознага характару: ад пытанняў працаўладкавання і наступстваў незаконнага звальнення да жыллёва-камунальных праблем і фінансавых спрэчак.

Сярод узнятых тэм гучалі і пытанні фінансавых абавязацельстваў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, прыватны перавозчык звярнуўся з праблемай запазычанасці за аказаныя паслугі, нехта прасіў дапамагчы з рамонтам дома... Жыхарка Светлагорскага раёна скардзілася на падтапленне ўчастка, у Карме гаварылі аб арганізацыі меддапамогі і стане дарог, у Хойніках — аб гандлёвым абслугоўванні. У Лоеве заяўнік прыйшоў абмеркаваць развіццё бульбаводства, у Брагіне грамадзяне прасілі растлумачыць некаторыя палажэнні «жыллёвага» ўказа Прэзідэнта, які выйшаў нядаўна, цікавіліся схемай аказання дапамогі ў навядзенні парадку на ўчастках адзінокіх пенсіянераў і інвалідаў. У Буда-Кашалёве ўзнялі пытанне аб гандлёвым абслугоўванні вёскі, у якой пражывае больш за 150 чалавек, у Жлобіне з сенатарам хацелі абмеркаваць сістэму адукацыі ў цэлым і развіццё ў краіне камандных відаў спорту, у Рэчыцы пыталі аб удасканаленні крымінальна-працэсуальнага заканадаўства.

Былі і нетыповыя звароты. Так, да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай, якая праводзіла прыём у Рагачове, звярнуўся жыхар вёскі Курганне. Мужчына прасіў дапамогі ў рэалізацыі мёду — ён сабраў яго са свайго пчальніка каля тоны і не можа прадаць...

Як падкрэслівалі сенатары, падводзячы вынікі прыёмаў, усе пытанні, з якімі звярталіся людзі, узяты на кантроль, аднак многія з іх маглі б вырашыцца на мясцовым узроўні. Але падобныя мерапрыемствы важныя і для членаў Савета Рэспублікі, бо звароты, з якімі прыходзіць насельніцтва на асабісты прыём, дазваляюць вызначыць, што насамрэч хвалюе людзей, якія неабходна прыняць дзейсныя меры па рашэнні ўзніклых праблем, убачыць асобныя недапрацоўкі і хібы ў заканадаўстве і пры неабходнасці ўнесці змяненні і дапаўненні ў заканадаўчыя акты. Гэта якраз тое, чаго ад заканадаўцаў патрабуе Прэзідэнт: законы павінны ісці «ад зямлі».

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**



НА КАНТРОЛІ ПРЭЗІДЭНТА

# «НАСТУПСТВЫ ТРЭБА ЛІКВІДАВАЦЬ

## Распрацоўка бураломаў пасля стыхіі: толькі на Магілёўшчыне –



**Магілёўшчына працягвае аднаўляцца пасля ўрагану. У чацвер, 17 ліпеня, абласны цэнтр наведаў міністр лясной гаспадаркі Аляксандр Кулік і на месцы азнаёміўся з маштабамі нанесенай непагаддзю шкоды. Па краіне ад шквалістага ветру пацярпела парадку 3,5 тысячы гектараў лесу, 2,5 тысячы з іх падлягаюць суцэльным санітарным высечкам. У прыватнасці па Магілёўскім лягсасе — каля 1500—1700 гектараў — амаль мільён кубаметраў драўніны. Усяго ў Магілёўскай вобласці пацярпела больш за 2,5 тысячы гектараў лесу. Для параўнання — у Мінскай вобласці — да 200 гектараў, у Віцебскай — каля 70.**

Аляксандр Кулік аб'ехаў лясны масіў вакол Магілёва і ўдакладніў, што больш дакладныя лічбы па страце лесу будуць вядомыя да панядзелка—аўторка. Але істотна яны не зменяцца. Што датычыцца аб'ёмаў, то, як падкрэсліў міністр, яны канчатkова вызначацца, калі драўніна будзе ляжаць у штабялях. Магілёўшчыне актыўна дапамагаюць Мінская і Віцебская вобласці. Плённы вопыт сумеснага супрацоўніцтва лесагаспадарчых аб'яднанняў напрацаваны падчас ранейшых надзвычайных сітуацый ураганнага паходжання. Стыхіі здараліся на тэрыторыі розных абласцей у 2022, 2024 і 2025 гадах. Летась моцна пацярпела Гомельская вобласць, сёлета — Магілёў і асабліва Магілёўскі лясгас.

Міністр звярнуў увагу на тое, што пасля навальніцы работнікі лясной гаспадаркі аднымі з першых прыйшлі на дапамогу насельніцтву.

— 700 чалавек былі задзейнічаны ў аднаўленчых работах, — паведаміў ён. — Вызвалялі праезды, аднаўлялі агароджы, электразабеспячэнне — усю інфраструктуру. Маштабы *сваёй* бяды сталі ацэньваць крыху пазней, спачатку дапамагалі людзям.

НА СЛЫХУ

# ЗАКРЫЦЦЁ ПУНКТАЎ ПРОПУСКУ, УЗМОЦНЕНЫ КАНТРОЛЬ

## Кіраўнік мытнага камітэта аб прычынах чэргаў на граніцы



Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Уладзімір АРЛОЎСКІ ў рамках Адзінага дня інфармавання расказаў журналістам, у чым прычыны чэргаў на граніцы і што робіцца беларускай мытняй для іх мінімізацыі.

### АБ ПРЫЧЫНАХ ЧЭРГАЎ

«Сітуацыя на мяжы з чэргамі складаная. Асноўная прычына — тое, што сумежныя краіны закрылі практычна ўсе пункты пропуску для руху транспартных сродкаў. Для перамяшчэння легкавых аўтамабіляў, аўтобусаў засталося ўсяго чатыры пункты пропуску: адзін на мяжы з Польшчай, два — з Літвой, адзін — з Латвіяй. Натуральна, як праз вузкае рыльца, называшаюцца транспартныя сродкі і ствараюцца чэргі. Асабліва напружаная сітуацыя ў летні перыяд, таму што да звычайных грамадзян, якія перасякаюць мяжу ў прыгранічным руху, дабаўляюцца турысты, грамадзяне былога Савецкага Саюза, якія пражываюць у краінах Еўразаюза і прыязджаюць на радзіму», — адзначыў Уладзімір Арлоўскі.

Самыя напружаныя — выхадныя дні. Што да выезду з краіны, то найбольш складаная сітуацыя назіраецца на польскім напрамку. «У чарзе можна стаяць і суткі, і двое. Мы прынялі рашэнне паўгода таму, каб пасля рэгістрацыі ў электроннай чарзе людзі маглі ад'ехаць па сваіх пытаннях і ўжо па адпаведным паведамленні прыязджаць на граніцу для перасячэння», — дадаў Уладзімір Арлоўскі.

Пры ўездзе асноўныя чэргі ўзнікаюць на польскім і літоўскім напрамках. «Тут гэтыя пытанні звязаны як з нерытмічнай падачай сумежным бокам транспартных сродкаў, так і з узмоцненым кантролем, у тым ліку беларускай мытні. Парушэнняў у дзеючых пунктах пропуску выяўляецца шмат, за суткі больш як 100. А гэта бяспека нашых грамадзян. Таму мы таксама ажыццяўляем узмоцнены кантроль, але прадпрымаем усе меры, каб гэта не паўплывала на значнае павелічэнне тэрміну перасячэння граніцы», — адзначыў Уладзімір Арлоўскі.

### ЯКІЯ ПАРУШЭННІ ВЫЯЎЛЯЮЦЦА

У інтэрнэце з'яўляюцца правакацыі ў дачыненні да мытных органаў. «Мы стараемся нашу работу асвятляць максімальна, каб людзі разумелі, што адбываецца, чаму ўведзены той жа ўзмоцнены кантроль», — адзначыў Уладзімір Арлоўскі.

Паводле яго слоў, толькі за апошні месяц спынена спроба ўвозу дзвюх буйных партый наркотыкаў. Адзін факт выяўлены ў пункце пропуску «Варшаўскі мост» два тыдні таму — знойдзена 50 кг моцнадзеючых псіхатропаў у легкавым аўтамабілі. «Вельмі складаная схованка. Прыйшлося разабраць практычна ўвесь аўтамабіль. Там жа маглі быць не толькі наркотыкі, але і ўзрыўчатка, зброя», — дадаў Уладзімір Арлоўскі.

Больш за месяц таму 100 кг наркотыкаў спрабавалі перавезці ў грузавым аўтамабілі ў пункце пропуску «Каменны Лог». У красавіку выявілі амаль 600 кг узрыўчаткі. Уладзімір Арлоўскі дадаў, што спробы парушэнняў заканадаўства, увозу забароненых тавараў рэгіструюцца пастаянна. І работа мытных службаў накіравана на гарантаванне бяспекі грамадзян. «Мы практычна ўжо з 2022 года працуем ва ўзмоцненым рэжыме, і гэта дае вынік», — сказаў старшыня ДМК.

Для таго каб мінімізаваць час на мытны кантроль, пункты пропуску ўзмоцнены неабходнай тэхнікай. У прыватнасці, у пункце пропуску «Варшаўскі мост» на мяжы з Польшчай да дагляднага комплексу, які скануе аўтамабілі, дадалі яшчэ адзін.

"Тое ж самае цяпер робім у пункце пропуску «Каменны Лог»: дадаем сканер для машын і для багажу. Мы стараемся тэхнічнымі сродкамі мінімізаваць час праходжання граніцы. Што датычыцца асабовага складу, у нас ёсць магчымасці з улікам рэзерву пасля закрыцця іншых пунктаў пропуску. Змены ўкамплектаваны максімальна, з супрацоўнікамі праблем няма. Цяпер імкнёмся забяспечыць тэхнікай», — расказаў старшыня ДМК.

### АБ СПРОБАХ НАПРУЖЫЦЬ СІТУАЦЫЮ

Ён пракаментаваў выпадкі, калі асобныя грамадзяне спрабуюць спецыяльна дэстабілізаваць абстаноўку, актыўна звяртаюцца да выкарыстання тэлеграм-чатаў. Адзін з апошніх: нібыта грамадзянін Літвы прастаяў на ўезд амаль суткі.

«Мы ўсе такія факты правяраем, адпаведную рэакцыю даём. Але, як правіла, такія ўкідванні — фэйкі», — падкрэсліў Уладзімір Арлоўскі.

**Паводле БелТА.**

# ЯКАСНА І АПЕРАТЫЎНА...»

## амаль мільён «кубоў» драўніны

На месцах здарэння ў лясах сёння працуе каля 100 харвестараў і 200 вальшчыкаў.

Вельмі аблягчаюць работу новыя высокатэхналагічныя машыны. На ўзбраенні Магілёўскага лягсаса нядаўна з'явіўся форвардар новага пакалення. Пакуль гэты ўзор адзіны ў Беларусі.

— Дзякуючы Прэзідэнту, наша галіна істотна аснашчана, закуплена шматаперацыйная тэхніка — харвестары, форвардары, лесавозы. Тэхнічныя сродкі значна паскараюць работу, — заўважыў міністр.

Пасля агляду лесу на базе Магілёўскага лягсаса сабраўся штаб пад кіраўніцтвам міністра. У ім узяў удзел старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка. На парадку дня былі пытанні аб спажыванні пашкоджанай драўніны. І адно з цэнтральных — яе рэалізацыя. Яшчэ ёсць рэшткі драўніны ад папярэдніх бураломаў. Прэзідэнтам пастаўлена задача да 1 верасня прыбраць з узлескаў і ўздоўж аўтадарог драўніну мінулага года. Міністр удакладніў, што тэхнічных сродкаў і людскога рэсурсу для гэтага хапае.

— З рэалізацыяй існуюць пэўныя складанасці, — заўважыў ён. — Калі па дзелавой драўніне рынкі збыту ёсць, то нізкатаварная асаблівага попыту не мае. У краіне за апошнія 30 гадоў газіфікаваны ўсе раёны, і насельніцтва актыўна карыстаецца блакітным палівам.

На думку Аляксандра Куліка, праблему трэба вырашаць глабальна.

— Ёсць неабходнасць у будаўніцтве яшчэ аднаго вялікага цэлюлознага камбіната, — кажа ён. — І ўрад сёння гэтым шчыльна займаецца. Не выключана, што такі камбінат з'явіцца на поўначы Магілёўскай вобласці або на яе мяжы з Віцебскай. Там засяроджаны рэсурс драўніны, які не запатрабаваны.

Міністр таксама звярнуў увагу на тое, што вопыт спажывання лясnoga багацця ў краіне ўдасканальваецца. Калі ў 2006 годзе рэалізацыя дзелавой драўніны складала 2,2 мільёна кубаметраў, то ў мінулым — 10 мільёнаў.

— Дзякуючы мудраму дзяржпадыходу да вядзення лясной гаспадаркі, кантролю з боку Прэзідэнта за выкарыстаннем лясных рэсурсаў, будаўніцтву і развіццю селекцыйна-насенняводчых цэнтраў вырашаны цэлы комплекс задач па развіцці лесагаспадарчай галіны, — адзначыў Аляксандр Кулік. — Наш вопыт вядзення лясной гаспадаркі цікавы і іншым краінам. Сёння яго ў нас актыўна пераймаюць расіяне.

Напярэдадні шмат работы. Гэта нарыхтоўка і вываз драўніны, ачыстка лесасек і высадка новых лясоў.

— Мы сёння бачым у Быхаўскім лягсасе прыклад гаспадарчага падыходу да справы, — заявіў міністр. — Задача, што ставілася Прэзідэнтам восенню мінулага года і вясной гэтага, каб на плошчах, якія прыдатныя для стварэння новых лясоў, было праведзена лесааднаўленне, выканана. Кіраўнік дзяржавы раіў рабіць справу талакой. І людзі гэты заклік падхапілі — разам мы пасадзілі новыя прыгожыя лясы. Стыхію прадухіліць нам не пад сілу, але наступствы павінны ліквідаваць аператыўна і якасна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з тэлеграм-канала mogilevnewsby.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Рубежевичи»** (продавец)
проводит повторный открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ СТОЛОВОЙ**

*(составные части и принадлежности: сарай, уборная, крыльцо)*

**площадью 217,6 кв. м, инв. № 622/С-41630, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 625482808601000107 (право аренды по 18.02.2063) площадью 0,1263 га, по адресу: Минская область, Столбцовский район, Литвенский с/с, д. Литва, ул. Центральная, 8.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **50,40** бел. руб.
Цена равна 1 (одной) базовой величине.
Задаток – **50,40** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: **www.rlt.by.**

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 18.08.2020, 13.10.2021, 12.04.2022, 17.02.2024, 04.04.2025.

Аукцион состоится **29.07.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.07.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801717) 3-58-49.**

УНН 600022457

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 50 %**

**Организатор аукциона:**
ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.
**Продавец:** ОАО «БЕЛФА», г. Жлобин,
247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2, УНП 400076540.

**Торги состоятся 31 июля 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28.**

**Блочная турбогенераторная установка с противодавлением пара «Кубань 0,75ПАЗ»**

**(заводской № 75002, 1999 г. в.) инв. № 141-5087.**

**Местонахождение:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2.

**Начальная цена с учетом НДС 20 % – 57 660,00 бел. руб.**

Задаток **10 % от начальной цены** перечисляется на р/с BY10 AKBB 3012 0310 1009 6000 0000, БИК AKBBBY2X в ЦБУ № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Жлобин, ул. Урицкого, 86, УНП 400076540, получатель платежа – ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

**Порядок ознакомления с имуществом** (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (029) 237-54-63 Макаревич Олег Васильевич. Шаг аукционных торгов – 5 %.**

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 18.07.2025 по 29.07.2025 с 9.00 до 16.00.**

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов: **https://ocenkaservis.by (раздел «Очные торги»).**

*Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 02.05.2025 г.*

**Контактные данные: (тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «МИНСККОНТРАКТ»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 30.07.2025.**

**Лот № 1:** ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР,
кузов, рама № WV2ZZZ70Z3X017379, 2002 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 14 670,00 руб.
Задаток – 1 467,00 руб.

**Лот № 2:** ГАЗ 3309,
кузов, рама № 33070080151785 X9633090080961477, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 8 100,00 руб.
Задаток – 810,00 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1–2:**
Минский р-н, пос. Сухорукие, ул. Базовская, 1А.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **28.07.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# ХЛЕБ НЕ БЫВАЕ ЛЁГКІМ

## Пры ўсіх сюрпрызах надвор'я ўжо першыя дні ўборачнай паказваюць, што ўраджай будзе не горшы, чым летась



**У дзень, калі мы прыехалі ў Лідскі раён, з раніцы там стаяў густы туман пасля начнога дажджу: іх гэтым летам надвор'е пасылае шчодра. Але гадзін да 11 туман стаў рассейвацца, у прасветы хмар выглянула сонца. Падняўся лёгкі ветрык, і ўжо бліжэй да поўдня збожжаўборачныя камбайны КСУП «Беліца-Агра» дружна выехалі ў поле, а літаральна ўслед за імі падкаціў УАЗ кіраўніка гаспадаркі Віктара СІНКЕВІЧА. Старшыня на свае вочы хацеў паглядзець, як стартуе чарговы дзень жніва.**

«Уборку мы пачалі літаральна некалькі дзён таму, у мінулую суботу, — падзяліўся Віктар Іванавіч. — Стартавалі бадзёра, зрабілі нямала, і настрой узняўся. А ў нядзелю нас тармазнуў дождж. Учора працавалі ўвесь дзень — надвор'е дазволіла, і дзякуючы гэтаму ўжо прыбралі практычна палову плошчаў азімага ячменю з вырашчаных 215 гектараў. Сёння з раніцы прыйшлося чакаць, пакуль пасевы падсохнуць. І вось мы зноў у справе. Камбайны, прэс-падборшчыкі, грузавікі — усе тут, каб аператыўна, не марнуючы часу, якасна прыбраць вырашчанае. Расслабляцца няма калі, наперадзе яшчэ шмат працы. Услед за азімым паспее яравы ячмень, а там і іншыя збожжавыя, і рапс на чарзе — гэтага беларускага золата ў нас 900 гектараў».

Поле сапраўды ажыло літаральна за лічаныя хвіліны. Кожны ўдзельнік гарачай пары добра ведае свае задачы, механізатары на ўборцы не першы год, тэхніка добра падрыхтавана, і таму ўвесь працэс ідзе зладжана і па-сапраўднаму прыгожа. «Як часта гавораць калегі, гэты год быў няпросты. Зрэшты, кожны год у сельскай гаспадарцы па-свойму складаны. Сёлетні не выключэнне. І разам з тым пры ўсіх сюрпрызах надвор'я ўжо першыя дні ўборачнай паказваюць, што ўраджай будзе не горшы, чым у гарачым мінулым годзе, калі па крузе сабралі 46 цэнтнераў з гектара», — гаворыць старшыня.

У КСУП «Беліца-Агра» на палях працуюць шэсць збожжаўборачных камбайнаў — гэта ўвесь парк гаспадаркі. Тэхніка выключна айчыннай вытворчасці і, як гаворыць кіраўнік, аграрыяў не падводзіць, што ў поўнай меры адносіцца і да тых трох машын, якія служаць амаль два дзясяткі гадоў, і да больш новых, адну з якіх атрымалі летась. «Гэта ўжо далёка не тыя камбайны, якія былі некалькі дзесяцігоддзяў таму, — гаворыць Віктар Іванавіч. — Ніхто не пацее ў кабінах, не стамляецца ў сярэдзіне дня ад спякоты. Ды і кіраванне імі патрабуе навыкаў, добрай падрыхтоўкі, каб ведаць, вобразна кажучы, на якую кнопачку націснуць. На такіх сучасных машынах намнога больш высокая выпрацоўка. Таму і той колькасці работнікаў, якая была неабходна калісьці, сёння не патрабуецца»

Уся тэхніка працуе як гадзіннік, і ў гэтым вялікая заслуга механізатараў. Як адзначыў Віктар Іванавіч, людзі разумеюць, што своечасова і цалкам падрыхтаваны камбайн дасць магчымасць у сезон добра папрацаваць і зарабіць. «За кожныя 500 тон намалоту выплачваем прэміяльныя, гэта 500 рублёў. А паколькі падчас уборкі ў нас ёсць і тысячнікі, і двухтысячнікі, то толькі за кошт матэрыяльнага заахвочвання можна добра прыбавіць у заробку, — растлумачыў старшыня. — Стымулюе і агульны чат, які мы стварылі ў месенджары. Прыкладна на працягу гадзіны пасля завяршэння працоўнага дня ўдзельнікі ўборкі ўжо ведаюць, колькі зарабілі за дзень, і могуць падлічыць свой заробак. Ну і дух спаборніцтва ніхто не адмяняў, смак перамогі прыемны кожнаму. Вядома ж, ёсць яшчэ стымуляцыйныя

**«МОЛАДЗЬ — ЗА ЎРАДЖАЙ»** — штогадовы рэспубліканскі праект, які праводзіцца БРСМ пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання і іншых зацікаўленых арганізацый. Удзельнікі праекта — маладзёжныя экіпажы, маладыя камбайнеры і вадзіцелі транспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць перавозку збожжавых і зернебабовых культур.



Ва ўборачнай кампаніі задзейнічаны 183 маладзёжныя экіпажы, 125 з якіх сёння працуюць у палях, а таксама 119 маладых вадзіцеляў, 65 ужо далучыліся да адвозкі збожжа.




Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Смолевичское райпо, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133. УНП 600048660 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1: Здание магазина** **(1873 кв. м,** 614/С-19321, составные части: подвал). Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, аг. Слобода, ул. Молодежная, 1Б**

***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **0,1314** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 07.01.2068) для обслуживания здания магазина № 40.
***Обременения*:** площади здания магазина частично сданы в аренду

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 1 476 390,00 бел. руб.** (снижена на 60 %)

**Лот № 2: Здание магазина (806,0 кв. м,** 614/С-19305). Адрес: **Минская обл., Смолевичский р-н, Жодинский с/с, аг. Барсуки, ул. Центральная, 4Б**

***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. **0,1231 га** предоставлен на праве аренды (срок действия по 21.04.2038) для обслуживания здания магазина № 79. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: охранная зона линий электропередачи (пл. 0,0038 га).
***Обременения*:** площади здания магазина частично сданы в аренду

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 518 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – 2 %, по лоту № 2 – 3 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликованы в газете «Звязда» от 22.05.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.08.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.08.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | ООО «ААА Солюшенс», УНП 19297125, г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38 |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| **1042** | **Дебиторская задолженность ООО «ААА Солюшенс»** (с полным списком дебиторов можно ознакомиться на торговой площадке: **www.torgi24.by)** | **3 724 576,55** |

**расположенный по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов (участников)

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – **не более 12 000,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 04.08.2025** в 11.00.
**Дата и время окончания торгов: 04.08.2025** в 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by.**
Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by.**
Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **18.07.2025 по 01.08.2025 с 9.00 до 17.00**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает об отмене электронных торгов по Лотам №№ 2, 6, 7, 9 – 19, назначенных на 22.07.2025 по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Минский завод игристых вин»** (Продавец).
Организатор электронных торгов: **8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03.** Электронный адрес ЭТП: **gostorg.by**

УНП 190055182



выплаты ад прафсаюза, і на «Дажынках», у гаспадарцы, у раёне і ў вобласці найлепшыя атрымліваюць заслужаныя ўзнагароды».

Пакуль мы гутарылі, кіраўнік гаспадаркі бакавым зрокам сачыў за тым, што адбываецца на ніве. Следам і мы паднялі вочы і ўбачылі ў кабіне камбайна сімпатычны дзявочы твар.

«Так, — пацвердзіў старшыня. — Аксана Мулінская на жніве ўжо не першы год. Гэта сямейная дынастыя. У гаспадарцы працаваў дзядуля, потым бацька. І Аксана засталася на малой радзіме, стала вадзіцелем. З бацькам у складзе сямейнага экіпажа дзяўчына і выйшла на поле ў гарачую пару. Бацька быў добрым камбайнерам і дачку многаму навучыў. А два гады таму яго не стала — сардэчны прыступ. Перажыўшы страту, Аксана сёлета зноў выказала жаданне выйсці на жніво».

«Сельскую гаспадарку люблю, — уключылася ў размову Аксана Мулінская. — Быў час, вырашыла паспрабаваць сябе ў «дальнабоі». Але ў выніку вярнулася ў Ганчары, стала вадзіцелем у КСУП «Беліца-Агра». Вось выйшла на жніво і думаю пра бацьку: ён бы мной ганарыўся».

Сямейных дынастый у «Беліцы-Агра», паводле слоў старшыні, нямала. Яшчэ адзін прыклад зусім побач: малады хлопец, які працуе на прэсподборшчыку, — Юрый Быстрыцкі, а за рулём цыстэрны з вадой, якая забяспечвае пажарную бяспеку, — яго бацька Казімір Вацлававіч. Старэйшы Быстрыцкі 15 гадоў працаваў на мясцовым камбайне «Ліда». Цяпер, на пенсіі, возіць кіраўніка, а ў гарачую пару выходзіць на палі. У КСУП працуе і другі сын Казіміра Вацлававіча — Віталь.

«Радуюся за сыноў, — падзяліўся Быстрыцкі-бацька. — Жывём побач, ва ўсіх свае жыллё, выкупілі з часам дамы, выдзеленыя гаспадаркай. І сам сядзець без справы не хачу. Яшчэ ў сілах, вось і працую. І тут, на жніве, спатрэбіўся».

Тым часам сонейка грэла, работа кіпела, і старшыня падзяліўся кароткатэрміновым прагнозам: да канца дня большую частку азімага ячменю прыбяруць, застанецца зусім няшмат. Гэта радуе, бо наперадзе яшчэ вялікія аб'ёмы. Агульная плошча азімых збожжавых у «Беліцы-Агра» — 1500 га, плюс 900 га азімага рапсу. Пад яравымі — 800 га. У дадатак яшчэ 460 га кукурузы на зерне і 800 га — на сілас. Плошчы прыстойныя: з 7,4 тыс. гектараў зямлі 5,5 тыс. — ворныя.

> На 16 ліпеня лідарам сярод маладых вадзіцеляў стаў Дзяніс ПАСЮК з КСПУП «Гродзенская птушкафабрыка». На МАЗ-6501 ён першым у краіне перавёз больш як 1000 т збожжавых. Усяго маладыя вадзіцелі перавезлі 9127,8 тоны, маладзёжныя экіпажы намалацілі 11 713,53 тоны.

Усяго на ўборцы збожжавых задзейнічаны 26 механізатараў. Гэтага дастаткова, адзначыў старшыня, — сучасная прадукцыйная тэхніка дае магчымасць справіцца. Калектыў механізатараў штогод папаўняецца моладдзю. Многіх вучаць па мэтавых дагаворах, ім выплачваецца штомесячная стыпендыя ад гаспадаркі — 5 базавых велічынь. У размешчаным непадалёк горадзе Бярозаўка хлопцы засяляюцца ў камфартабельны інтэрнат.

«Часта сустракаюся з вучнямі ў школах, асабліва з аграрных класаў, і заўсёды сумленна і адкрыта расказваю аб рабоце ў сельскай гаспадарцы. З кожным годам жыццё і работа ў вёсцы становяцца ўсё больш камфортнымі. Але я перакананы, што і пра тыя выклікі, з якімі трэба будзе спраўляцца, моладзь таксама павінна ведаць, каб потым не расчаравацца. Праца ў сельскай гаспадарцы патрабуе вялікай аддачы. Але калі яе любіць, яна прыносіць вялікую радасць», — лічыць Віктар Сінкевіч.

Яго пазіцыя плённая — гэта пацвярджаецца фактамі. У калектыве КСУП «Беліца-Агра» нямала моладзі, у тым ліку на адказных пасадах. Намесніку кіраўніка гаспадаркі — 27 гадоў, столькі ж галоўнаму механіку, галоўнаму энергетыку — 25. Ёсць 20-гадовая дзяўчына-аграном, 23-гадовы брыгадзір з эканамічнай адукацыяй. Два маладыя хлопцы пасля заканчэння Лідскага каледжа прыйшлі працаваць механізатарамі. «Такая ў нас маладая каманда. Гэта тыя, хто прафесію выбраў з розумам і па сэрцы. З такімі калегамі ёсць перспектывы ў гаспадаркі», — падкрэсліў кіраўнік.

**Лілія НАВІЦКАЯ.**
**Фота Леаніда ШЧАГЛОВА, БелТА.**




Наименование банка:

## ОАО «НКФО «ЕРИП»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
### 30 июня 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.06.2025 | 01.01.2025 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | - | - |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 625 | 3 350 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 79 399 | 80 311 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 7 164 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | - | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 893 | 864 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 801 | 7 943 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 4 723 | 5 502 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 110 605 | 97 970 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 6 548 | 3 053 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3 691 | 3 006 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 10 239 | 6 059 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 74 459 | 57 945 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 4 507 | 3 356 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | (61) | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 21 461 | 30 610 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 100 366 | 91 911 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 110 605 | 97 970 |

### ОТЧЕТ
### о прибылях и убытках
### за январь-июнь 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 30.06.2025 | 30.06.2024 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 6 206 | 3 378 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 154 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 052 | 3 378 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 24 601 | 20 691 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 6 | 5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 24 595 | 20 686 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | - | - |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (5) | 44 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 880 | 2 062 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 13 846 | 11 083 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 227 | 228 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 18 459 | 14 771 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 5 029 | 3 919 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 13 430 | 10 852 |

Заместитель Председателя Правления

Главный бухгалтер

Дата подписания: 09 июля 2025 г.

УНП 807000268

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**на долевое строительство жилых помещений в составе объекта «Строительство жилых многоквартирных домов в районе СШ № 1 в г. Фаниполе Дзержинского района Минской области. I, II очередь строительства. I очередь строительства» на коммерческой основе**
(без использования государственной поддержки)

**Застройщик:** ЗАО «ДГ-Центр» зарегистрировано Дзержинским РИК 24.06.2008 в ЕГР за № 690557618.

**Юридический адрес:** 222750, Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, д. 39А/3, пом. 20.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 09.00 до 17.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Сведения о проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости, в которых принимал участие застройщик в 2020-2024 г.г.:**

ЗАО «ДГ-Центр» являлось заказчиком строительства:
- склада с административно-бытовыми помещениями в г. Фаниполе – 14 месяцев;
- жилого многоквартирного дома по ул. Брестской, д. 3 в г. Фаниполе – 7,5 месяцев;
- жилого многоквартирного дома по ул. Брестской, д. 3А в г. Фаниполе – 10 месяцев;
- жилого многоквартирного дома по ул. Брестской, д. 3Б в г. Фаниполе – 9,5 месяцев;
- склада с административно-бытовыми помещениями в г. Фаниполе – 8,5 месяцев.

**Информация об объекте строительства**

Строительство осуществляется согласно инвестиционному договору, зарегистрированному в Государственном реестре инвестиционных договоров 19.04.2019 за № ИД-2098.

Расположение объекта – Минская область, г. Фаниполь, в районе СШ № 1.

Свидетельства о государственной регистрации земельных участков: № 620/1657–7742, № 620/1657-7743, № 620/1657-7744, № 620/1657-7745, № 620/1657-7746, № 620/1657-7747 земельные участки предоставлены Застройщику на праве аренды.

Проектная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 26.04.2025 № 300-70/25).

Начало строительства – II квартал 2025 г., окончание строительства – I квартал 2027 г.

Подрядной организацией является ОАО «Солигорский ДСК». Договор строительного подряда №03-07/2025 на строительство объекта «Строительство жилых многоквартирных домов в районе СШ № 1 в г. Фаниполе Дзержинского района Минской области. I, II очередь строительства. I очередь строительства» заключен 11.07.2025.

Объект строительства зарегистрирован инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по Минской области (извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства № 1-105Ж-332/25 от 06.06.2025).

**Основные характеристики объекта**

200-квартирный панельный жилой дом, количество секций – 2, количество этажей – 10. Проектом предусмотрены балконы с металлическим решётчатым ограждением, остеклённые лоджии и отделка мест общего пользования.

На первом этаже размещены встроенные помещения «колясочная» и «кладовая уборочного инвентаря», лифт в каждой секции. Благоустройство включает озеленение территории, устройство тротуаров, пешеходных дорожек, площадка сбора ТБО, детская игровая и спортивная площадки, автомобильная стоянка на 112 машино-мест, строительство велогаража, ТП, котельная.

Строительство жилых помещений производится без внутренней отделки (предусмотрена цементно-песчаной стяжкой для пола).

Каждое жилое помещение оснащено приборами учёта электроэнергии, теплоэнергии, потребления холодной и горячей воды, сан. узел оборудован унитазом.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 73/3, 5 эт., офис 5, по тел.: +375 29 190 64 64 (А1), +375 29 333 33 94 (А1).

**Порядок заключения договоров**

**1.** Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий по направлениям Фанипольского горисполкома. Для заключения договоров предлагаются:

17 (семнадцать) двухкомнатных квартир общей площадью по СНБ 63,43 м², стоимость 1 м² (по СНБ) 3 397,35 бел. рублей.

**2.** Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с иными гражданами, не состоящими на учёте нуждающихся в улучшении жилищных условий, а также с юридическими лицами. Для заключения договоров предлагаются:

45 (сорок пять) студий общей площадью по СНБ от 18,24 м² до 26,26 м², стоимость 1 м² (по СНБ) от 4 285,00 бел. рублей до 4 800,00 бел. рублей; 73 (семьдесят три) однокомнатных квартир общей площадью по СНБ от 33,72 м² до 41,71 м², стоимость 1 м² (по СНБ) от 4 000,00 бел. рублей до 4 400,00 бел. рублей;

23 (двадцать три) двухкомнатные квартиры общей площадью по СНБ 63,43 м², стоимость 1 м² (по СНБ) от 3 600,00 бел. рублей до 3 700,00 бел. рублей.

На предприятии действует система регулирования стоимости квартир в зависимости от площади, этажа и порядка оплаты.

**Условия оплаты**

Оплата цены квартиры производится дольщиком в соответствии с графиком платежей. Для подачи заявления гражданам при себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство, ID-карта).

Настоящая проектная декларация действует до момента публикации следующей проектной декларации.

УНП 690557618



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «АМКОДОР» – управляющая компания холдинга»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 21.08.2025 в 11.00.**

**Лот № 1:**
Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 500/U-65431.

Адрес: г. Минск, ул. Пономаренко, 7/12.

Начальная цена с НДС 20 % – 3 079 504,50 руб.

Задаток – 153 975,23 руб.

Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 500/U-65431 расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000006000098 (площадь 7,6447 га).

Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **19.08.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by.**

УНП 190055182


# ВУЧНЁЎСКІ «СПАЖЫВЕЦКІ КОШЫК»





## МОЖНА ЗАКАЗАЦЬ АНЛАЙН

Як паведаміла **кансультант аддзела спажывецкага рынку ўпраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Кацярына МАКУЦЭНЯ**, у апошні час спажыўцы актыўна ажыццяўляюць пакупкі тавараў лёгкай прамысловасці, у тым ліку школьнага асартыменту праз маркетплэйсы: «Асобнымі вытворцамі арганізавана работа інтэрнэт-крам са зручнай сістэмай дастаўкі тавараў па ўсёй краіне».

Традыцыйныя формы гандлю таксама ніхто не спісвае з рахункаў. «Работа школьных кірмашоў у гэтым сезоне запланавана ў раённых цэнтрах, — адзначыла спецыяліст, — а выязное гандлёвае абслугоўванне будзе ажыццяўляцца і ў буйных аграгарадках раёнаў з удзелам канцэрна «Беллегпрам», дзе будзе праведзена дэманстрацыя адзення дзелавога стылю і школьных тавараў. Інфармацыю аб актуальных акцыях, мерапрыемствах і месцах продажаў можна даведацца на сайтах рэгіянальных органаў кіравання, канцэрна «Беллегпрам», аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама, а таксама ў інфармацыйных крыніцах гандлёвых арганізацый».

Што датычыцца кірмашовых мерапрыемстваў, у гэтым сезоне іх запланавана каля 350! «Найбольшы ажыятаж мы будзем назіраць у жніўні і ў пачатку верасня. Гэта адзначаецца і гандлёвымі арганізацыямі. Зноў жа многімі гандлёвымі арганізацыямі будуць прапанаваны акцыі, зніжкі, распродажы, а таксама паслугі па падгонцы адзення», — адзначыла Кацярына Макуцэня.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ДА 300 НАЙМЕННЯЎ АДЗЕННЯ ДЗЕЛАВОГА СТЫЛЮ...

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства адукацыі ад 15 красавіка 2025 года № 72, для вучняў агульнай сярэдняй адукацыі зацверджаны дзелавы стыль адзення, які ўключае камплекты для хлопчыкаў і дзяўчынак. У набор для хлопчыкаў уваходзіць пінжак, камізэлька, штаны, кашуля з кароткімі і доўгімі рукавамі, джэмпер, гольф і гальштук. Для дзяўчынак прапануецца пінжак, камізэлька, спадніца, блузка, штаны, сарафан, сукенка і джэмпер. Падрыхтавана больш за 250 новых мадэляў, таму адзеннем дзелавога стылю спажыўцы будуць забяспечаны ў максімальным аб'ёме.

«Адзенне дзелавога стылю прадстаўлена да 300 найменнямі, абутку — да 120 мадэляў, ранцаў і заплечнікаў — да 50 мадэляў. Акрамя таго, варта адзначыць, што ў гандлёвых аб'ектах краіны школьны асартымент сфарміраваны пераважна за кошт тавараў айчыннай вытворчасці. Яны выпрабляюцца па пэўных стандартах: з натуральных тканін з даданнем сінтэтычных валокнаў для большай зносаўстойлівасці. Прадукцыя замежнай вытворчасці павінна мець сертыфікат якасці краіны-імпарцёра і адпавядаць тэхнічнаму рэгламенту Мытнага саюза аб бяспецы тавараў лёгкай прамысловасці. Кантрольныя мерапрыемствы на адпаведнасць прадукцыі патрабаванням якасці і бяспекі праводзіць Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі. У выпадку выяўлення недабраякаснай прадукцыі яна адбіраецца з абароту», — дадала спецыяліст.

## ПОЎНЫ КАМПЛЕКТ — АД 335 ДА 1 385 РУБЛЁЎ

Што датычыцца цэн на тавары школьнага асартыменту, на сёння ў Беларусі дзейнічае цэнавае рэгуляванне, якое ажыццяўляецца па ўсім ланцужку ўстанаўлення цаны на розныя віды тавараў. «Сюды ж уваходзіць практычна ўвесь асартыментны пералік дзіцячага адзення — гэта курткі — зімовая, дэмісезонная, штаны, касцюм спартыўны, сарафан, світэр, жакет, камізэлька, кашуля, верхняя сукенка, спадніца, блузка. Лімітавая максімальная гандлёвая надбаўка на прадукцыю як імпартнай, так і айчыннай вытворчасці складае 40 %. У цэлым у крамах памер гандлёвай надбаўкі (з улікам акцый і зніжак) складае прыкладна 29—40 %», — адзначыла Кацярына Макуцэня.

Што датычыцца кошту поўнага камплекта тавараў для школьнікаў, у які ўваходзіць адзенне швейнае і трыкатажнае, абутак, заплечнік, сумка, канцылярскія і школьныя прыналежнасці, у сярэднім па краіне — ад 335 да 1 385 рублёў. Акрамя таго, спажыўцам прапануюцца праграмы крэдытавання і растэрміноўкі, а таксама свае зніжкі і акцыі за кошт уласных сродкаў арганізацый, у тым ліку і мерапрыемствы сацыяльнай накіраванасці — аказанне дапамогі шматдзетным сем'ям пры прадастаўленні пасведчання, або сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Максімальная колькасць зніжак запланавана на жнівень, якраз у пік продажу тавараў школьнага асартыменту. Акрамя таго, гандлёвымі арганізацыямі і арганізацыямі-вытворцамі прапануюцца да продажу калекцыі мінулых сезонаў са зніжкамі да 50 %.



Пры рабоце школьных кірмашоў на галоўнае месца выходзіць кантрольная функцыя. «Пытанне забеспячэння таварамі школьнага асартыменту ў шырокай прадстаўленасці і ўзровень цэн на гэтыя тавары на кантролі МАРГ, органаў кіравання гандлем аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. У нас прадугледжаны кантрольныя аналітычныя мерапрыемствы па ўсёй краіне. Іх мэта — маніторынг наяўнасці ў продажы шырокага асартыменту тавараў для школьнікаў, аналіз рознічных цэн на тавары дашкольнага і школьнага ўзросту і недапушчэнне парушэння заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў. У цэлым сітуацыя ў гандлёвых аб'ектах назіраецца спакойная. Попыт забяспечаны ў поўным аб'ёме. Нараканняў з боку пакупнікоў не зафіксавана», — рэзюмавала Кацярына Макуцэня.

## ТАВАРАЎ І ЗНІЖАК — НА ЛЮБЫ ГУСТ І КОЛЕР

Ва ўнівермагах сталіцы прадстаўлены найшырэйшы асартымент швейных, трыкатажных, скургалантарэйных вырабаў, абутку, пісьмовых прылад, паведаміла **начальнік аддзела развіцця гандлю і паслуг ГА «Сталічны гандаль і паслугі» Анастасія МАКАРСКАЯ**: «Прааналізаваўшы даныя ад рэалізацыі падобных тавараў за мінулы год, мы адзначылі сапраўды добры попыт. Больш за 122 тысячы пазіцый швейных, трыкатажных, галантарэйных вырабаў і абутку рэалізаваны ў нашых універмагах. Гэта больш за 73 % ад створаных запасаў, што гаворыць аб добрым і стабільным попыце, які задавальняе жыхароў і гасцей сталіцы. Ужо сёння ва ўнівермагах прадстаўлена больш за 155 мадэляў дзелавых касцюмаў для дзяўчынак, больш за 140 мадэляў касцюмаў і дзелавога адзення для хлопчыкаў, каля 100 найменняў мадэляў абутку і больш за 130 мадэляў скургалантарэйных вырабаў».

Паводле яе слоў, маркетынгавыя мерапрыемствы ў беларускай сталіцы стартавалі з 15 ліпеня: «А каб пакупкі былі яшчэ больш прыемнымі, у ЦУМе кожную сераду праходзіць «Дзень школьніка» са зніжэннем цэн на школьны асартымент на 15 %. Дадаткова таксама будзе праводзіцца распродаж школьнага асартыменту са зніжэннем цэн да 30 %. Акцыі са зніжкамі да 25 % стартавалі і ва ўнівермагу «Беларусь» — тавары па такіх коштах можна будзе набыць кожны аўторак, чацвер і суботу. Аналагічная акцыя будзе праводзіцца ў Гандлёвым доме «На Нямізе» па серадах, пятніцах і суботах. Зніжкі да 30 % на тавары таксама прапануе ГУМ. Каляндар гэтых акцый можна знайсці на сайце прадпрыемства. Акрамя таго, з 1 па 31 жніўня ўсім пакупнікам універмагі дадуць бясплатную паслугу па падгонцы швейных вырабаў па фігуры дзяцей і ўшыўцы».

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

# ПАВАРОТ НА СЯРЭДЗІНЕ ШЛЯХУ

**Гродзенец праз тры дзесяцігоддзі... зноў стаў студэнтам**

Ігар САРАТОКІН у свае 56 гадоў вучыцца на другім курсе ў магістратуры. Але ён не адзіны такі. Толькі ў ГрДУ імя Янкі Купалы ёсць магістранты, якім за 50, 60 і нават 70 гадоў. Ігар — той з іх, хто пагадзіўся расказаць пра сябе.

## У ПОШУКУ АДКАЗАЎ

Мужчына працуе выкладчыкам у Гродзенскім дзяржаўным электратэхнічным каледжы імя Івана Шчаснага, але яго другая вышэйшая адукацыя ніяк не звязана з першай і, увогуле, з кар'ерай. Большую частку свайго прафесійнага шляху Ігар Саратокін прайшоў на «Гродна Азоце» — 28 гадоў аддадзена прадпрыемству. А перш чым паступіць у магістратуру, герой атрымаў другую вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «Псіхолаг. Выкладчык псіхалогіі». Цікаўлюся, чаму вырашыў гэтак кардынальна змяніць жыццё.

— Пачаць хачу з таго, што вельмі ўдзячны прадпрыемству, з цяплом стаўлюся да работы там, сышоў на пазітыўнай ноце. Проста бліжэй да 50 гадоў усё часцей пачаў задумвацца пра сэнс жыцця, пра тое, ці ўсё правільна рабіў. Ці сваім шляхам іду, — расказвае Ігар. — У мяне тэхнічная адукацыя, шмат гадоў адпрацаваў у цэху. У нейкі момант мне захацелася цалкам змяніць сферу дзейнасці, даведацца пра нешта новае, а таксама адказаць на пытанні, якія мяне хвалююць. Вырашыў, што з усім гэтым мне дапаможа псіхалогія — навука аб душы.

## ПРАГА НОВЫХ ВЕДАЎ

Ужо даўно даказана, што наш мозг любіць пратаптаныя сцяжынкі, звыклы ўклад жыцця і не вельмі вітае перамены, нават калі яны ідуць на карысць. А тут чалавек вырашае змяніць зразумелую, знаёмую работу, праз дзесяцігоддзі зноў стаць студэнтам. Спытала, ці не страшна было. Мой суразмоўнік лаканічна адказаў: «Не». Для журналіста аднаскладовы адказ — гэта невыкананая работа, таму прашу распавесці падрабязней.

— За 28 гадоў работы ў адным калектыве выпрацоўваюцца пэўныя алгарытмы дзеянняў, ты ведаеш, як вырашыць тое ці іншае пытанне. Назапашаны досвед і павага, вядома, прыемныя, але сітуацыі становяцца шаблоннымі, дзесьці замыльваецца погляд і ты робіш усё як бы на аўтамаце. І вось гэты сумнеў у правільнасці абранай звыклай дарогі, а таксама прага новых ведаў дазваляюць без страху ісці наперад. Да таго ж я вернік, у рэлігіі знаходжу апору. І я цудоўна адчуваю сябе ў ролі студэнта. Спачатку перажываў толькі за здольнасць запамінаць інфармацыю, хваляваўся, што будзе складана. Але мае выкладчыкі сказалі, што памяць можна развіваць і з часам я асвоюся. Так і сталася. А яшчэ я зараз нібы другую маладосць пражываю! Вельмі цікавыя адчуванні.

## ГЛЫБОКАЕ ПАГРУЖЭННЕ

Ігар Саратокін адзначыў, што і на першай, і на другой акадэмічнай ступені вучоба для яго — задавальненне. Аднагрупнікі цікавыя, многія з іх таксама шукаюць адказы на экзістэнцыяльныя пытанні, у кожнага свой погляд на свет.

— У магістратуру вырашыў паступіць, таму што зразумеў: трэба атрымаць больш глыбокія веды. Адчуў неабходнасць яшчэ лепш разабрацца ў прадмеце. Мне спадабалася займацца навукай, рыхтаваць дыпломную работу, вырашыў прадоўжыць. Мой навуковы кіраўнік Марына Карняловіч вельмі дапамагала мне, падтрымлівала, зрэшты, як і ўсе выкладчыкі кафедры. Тэма маёй дысертацыі «Альтруізм і саўладальныя [А.У.1] паводзіны ў прадстаўнікоў розных сацыяльных груп». Праблема аказалася вельмі аб'ёмнай, і я ўзяў акадэмічны водпуск, каб падрабязна вывучыць літаратуру, пагрузіцца ў тэму. Да таго ж у мяне кантракт на прадпрыемстве падыходзіў да канца, і я вырашыў, што не буду яго працягваць. З пачатку года займаўся навуковымі пошукамі, і вось зараз аднавіўся, і буду прадаўжаць навучанне. Трэба даследаванне прывесці ў парадак, бо спіс літаратуры ў мяне зараз 160 крыніц.

## КАЛІ АДНО ДРУГОМУ ДАПАМАГАЕ

Праца ў цэху і выкладанне — зусім розныя сферы. Цікаўлюся ў Ігара Саратокіна, ці не страшна быць выкладчыкам.

— Не страшна. Я працаваў намеснікам начальніка цэха, па рабоце ўзаемадзейнічаў з вялікай колькасцю людзей. Тым больш што ў каледжы ўжо дастаткова дарослыя навучэнцы. З малымі мне складана. На вучэбнай практыцы працаваў з маленькімі дзецьмі. Да іх патрэбен вельмі далікатны падыход. Выкладаць падабаецца, а вось да таго, што трэба шмат ад рукі пісаць, прызвычаіцца не магу, — усміхаецца Ігар Саратокін.

Выкладчык зазначае, што сучасныя ўмовы сістэмы адукацыі дазваляюць рабіць якасныя лекцыі, якія будуць цікавыя моладзі. Ён перакананы, што добра пададзены матэрыял можа захапіць нават таго, хто зусім не хоча вучыцца.



— Спецыяльнасць у мяне тэхнічная, выкладаю ўладкаванне аўтамабіляў, а псіхалагічная адукацыя дапамагае ў працы.

У найбліжэйшых планах у Ігара Саратокіна, вядома, абараніць магістарскую дысертацыю, а пасля паступіць у аспірантуру. Дарэчы, сябры, родныя і блізкія падтрымліваюць яго. Значыць, бачаць па чалавеку — гэта яго. Гісторыя Ігара не пра тое, што ў сярэдзіне жыцця варта ўсё памяняць. Сваім прыкладам герой сцвярджае, што ніколі не позна шукаць сябе, а калі шукаеш, то ёсць шанц, што знойдзеш!

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота з архіва Ігара САРАТОКІНА.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «БелшинаТранс», Могилевская область, г. Бобруйск, Минское шоссе. УНП 790913853 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Минское шоссе (территория ОАО «Белшина»)

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Погрузчик фронтальный (категория «F»)**, ТО-18Б, МБ 6317, 1993 г. в. | **21 360,00** |
| 2 | **Грузовой седельный тягач MAZ-544069 320-031,** AI 7879-6, 2008 г. в. | **16 000,00** (снижена на 5 %) |
| 3 | **Машина универсальная «Беларус» МУ-466**, IB-6 2049, 2012 г. в. | **177 361,96** |
| 4 | **Автобус вагон MAZ 256170**, рег. № АВ4216-6, 2011 г. в. | **14 460,00** |
| 5 | **Грузовой специальный автокран MAZ-5337 KS-45729-4,** АВ6051-6, 2011 г. в. | **48 600,00** (снижена на 10 %) |
| 6 | **Машина погрузочная универсальная Амкодор-37**, IB-6 2039, 2012 г. в. | **24 000,00** |
| 7 | **Экскаватор ЕК-18-20**, ТА-6 3484, 2007 г. в. | **64 800,00** |
| 8 | **Автопогрузчик**, 2006 г. в. | **14 400,00** (снижена на 10 %) |
| 9 | **Автопогрузчик**, 2006 г. в. | **9 600,00** (снижена на 10 %) |
| 10 | **Автопогрузчик**, 2006 г. в. | **13 440,00** (снижена на 10 %) |

**Шаг аукциона: 5 % от текущей цены**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов. Подробная информация о проведении торгов размещена на сайте www.ipmtorgi.by

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 03.06.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 31.07.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **филиала «ПСХ «Наша Нива» ОАО «СЛУЦКИЙ МЯСОКОМБИНАТ»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ **КЛУБА**
**с инв. № 640/С-116292 общ. пл. 238,5 кв. м**
**(составные части и принадлежности: хозпостройка, уборная), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624680801601000253 площадью 0,2419 га (право аренды по 11.04.2075) по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, Бокшицкий с/с, д. Городище, ул. Садовая, 46.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **13 300,02** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 330,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **19.08.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.08.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8017) 95 76 1 82, 029 355 89 02.**

УНП 601067609



Первичная профсоюзная организация **Открытого акционерного общества «Пинский завод искусственных кож»** Белорусского профессионального союза работников отраслей промышленности «БЕЛПРОФМАШ» ликвидируется. Претензии принимаются в течение двух месяцев с момента опубликования данного объявления по адресу: 225710, г. Пинск, ул. Брестская, дом 57.

УНП 200335354

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
***проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества***

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. № 500/D-7113080, расположенное по адресу: г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, 52-1. Площадь – 5132,2 кв. м. Наименование – Помещение многофункциональное. Назначение – Помещение многофункциональное. Объект недвижимости обременен арендой, ипотекой. Продавец обязуется снять обременение ипотекой до момента государственной регистрации договора купли-продажи с покупателем | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **5 707 327,5** | **Задаток, BYN** | **285 366,38** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **ЛОТ № 2** | Капитальное строение с инв. № 500/С-24792, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 41. Площадь – 5415,7 кв. м. Наименование – Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Назначение – Здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения. Объект недвижимости обременен арендой. Капитальное строение расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000007001069 площадью 3,5098 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен). На земельном участке установлены следующие ограничения: охранная зона канализации, площадь 0,1551 га | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **7 829 907,12** | **Задаток, BYN** | **391 495,36** | **Шаг аукциона** | 5 % |
| **Сведения о продавце/организаторе аукциона, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. тел.: 8 017 284 94 32, 8 029 754 63 46, Мария; e-mail: arenda@h-holding.by | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 25 июля 2025 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **28 июля 2025 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона | | | | | |

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) – проводит четвертые повторные торги в форме открытого аукциона
по продаже **зданий (6 лотов),**
расположенных по адресу:
**Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 15,**
принадлежащие **ОАО «Мозырский спиртоводочный завод»**
(Антикризисный управляющий – ООО «СтанИБор» (УНП 491343813) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 118-10Б/2016).

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на сайте **www.bankrot.gov.by** либо на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** и по тел.: +375 29 805 93 30 (Светлана Павловна), +375 29 8717025 (Валерий Петрович), на сайте www.cpo.by.

**Аукцион состоятся 30.07.2025 в 13.00**
по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512.
Заявки принимаются **с 16.07.2025 с 09.00 по 29.07.2025 до 17.00** по указанному адресу

**ОАО «Пинский винодельческий завод»**
сообщает о проведении **15.08.2025 г.** первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже:

**1) Изолированное помещение с инв. номером 130/D-53249, расположенное по адресу: Брестская область, г, Пинск, ул. Черняховского, д. 34, площадью 158,0 кв. м – 141 000,00 бел. руб. без НДС.**

**2) Прицеп специальный цистерна 825601, 2010 г. в. А0966 В-1 – 3 300,00 бел. руб. без НДС.**

**Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by.**

УНН 200110728

# КАБ МІНСК НЕ ПЕРАТВАРАЎСЯ Ў ВЕНЕЦЫЮ


Фота БелТА.

## ПРАГРАМА «ПАСЕЙДОН»

Цяпер у Мінску і вакол яго будуюцца новыя аб'екты, у тым ліку ліўневыя ачышчальныя збудаванні. Адзін з найбольш буйных — ліўневы калектар «Яркава», які забяспечыць водаадвядзенне з тэрыторыі Фрунзенскага раёна. Завяршыць работы тут плануецца да канца года. Дадаткова распрацоўваецца яшчэ восем участкаў ліўневых каналізацый па Мінску. Праектуецца і некалькі аб'ектаў перахопу сцёкаў.

— Нельга сказаць, што гэта дастатковы аб'ём работ. Зацверджаная праграма «Пасейдон» прадугледжвае тры этапы. Першы павінен закрыць першачарговыя вострыя праблемы, другі разлічаны на сярэднятэрміновую перспектыву, трэці прадугледжвае ўзвядзенне выпускных калектараў, ачысткі сістэмы і інш. Да першага этапу мы прыступілі і плануем яго рэалізаваць у найбліжэйшыя год-паўтара. «Яркава» ў поўнай меры рэалізуем сёлета, — кажа **дырэктар ДП «Гардарбуд» Сяргей ПАНЁЎ.**

Што ж зменіцца з уводам «Яркава»? Праект дазволіць перахопліваць вялікія аб'ёмы ліўневых вод на падыходах да Фрунзенскага раёна і накіроўваць іх адразу ў вадасховішча Яркава. Аб'ект ахоплівае вялікую прамысловую тэрыторыю на ўскраіне сталіцы — у зоне вуліцы Мантажнікаў. Дажджавыя воды з гэтай плошчы больш не будуць трапляць у агульную ліўневую сістэму Фрунзенскага раёна, што аблегчыць сітуацыю ва ўсім раёне. У далейшым запланавана замена калектараў на большыя ў дыяметры.

— Схема для пазбягання падтапленняў разлічана і падрыхтавана. Цяпер займаемся рэалізацыяй, — рэзюмаваў Сяргей Панёў.

## У РЭЖЫМЕ 24/7

Маштабныя работы вядуцца ў сталіцы і па капрамонце пяці пуцеправодаў і мастоў. Капрамонт двух ужо завершаны. Адзін з іх знаходзіцца на вуліцы Даўгабродскай і перасякае вуліцу Ванеева. Другі, праз чыгуначныя пуці на вуліцы Брэст-Літоўскай, прыняты ў эксплуатацыю ў красавіку. Актыўныя дэмантажныя работы цяпер праводзяцца на мосце, які падлягае капрамонту, цераз Свіслач па вуліцы Галадзеда. Тэрмін іх завяршэння — снежань. Да канца гэтага года будзе поўнасцю адкрыты рух і па абноўленым пуцеправодзе на вуліцы Ваўпшасава.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Галоўны ж аб'ект, на якім цяпер засяроджана ўвага «Гардарбуда», — самы працяглы пуцепровад сталіцы (даўжыня 289 метраў), які злучае праспект Незалежнасці і вуліцу Маскоўскую. Пасля рэканструкцыі яго цэнтральны пралёт даўжынёй 160 метраў над чыгуначнымі пуцямі будзе мець металічную аснову, што забяспечыць надзейнасць і даўгавечнасць. Тут, як і на астатніх маставых збудаваннях, работы вядуцца без выхадных дзён у рэжыме 24/7. Гэты аб'ект таксама плануецца ўвесці ў эксплуатацыю да канца бягучага года.

— У Мінску на сёння 106 пуцеправодаў і мастоў, планавае абнаўленне часткі з іх пачалося яшчэ некалькі гадоў таму. 26 з іх ужо прайшлі рэканструкцыю і капрамонт. У нас дастаткова рэгулярна праводзяцца абследаванні гэтых штучных збудаванняў, таму ў асноўным яны знаходзяцца ў здавальняючым стане. Складзены пералік аб'ектаў, якія намечана адрамантаваць да 2030 года. Гэта каля 30 пуцеправодаў і мастоў, — праінфармаваў Сяргей Панёў.

## З МІНІМАЛЬНЫМІ НЯЗРУЧНАСЦЯМІ ДЛЯ ГАРАДЖАН

Улетку найбольш актыўна вядзецца і абнаўленне сталічных вуліц. Гэта як ямачны рамонт, устараненне каляйнасці, герметызацыя расколін, так і поўная замена пакрыцця. Сёлета рамонтныя работы былі запланаваны на плошчы 1 млн 885 тысяч кв. м. Адметна, што большая іх частка ўжо выканана. Цалкам абнавілі пакрыццё па вуліцы Карбышава, на ўчастку праспекта Машэрава, вядуцца работы на праспекце Дзяржынскага ў раёне МКАД. Увогуле ж дарожнае пакрыццё заменяць на 60 сталічных вуліцах ці іх участках агульнай плошчай звыш 1 млн кв. м. На плошчы 423,7 тыс. кв. м пакрыццё ўжо абноўлена. Завершаны работы на вуліцах Сыракомлі, Чачота, Ташкенцкай, Казінца, Я. Коласа, Сапёраў, Смілавіцкім тракце, асобных участках МКАД.

Акрамя таго, праводзяцца работы па ўладкаванні штучных няроўнасцяў і канструкцыйных завужэнняў праезнай часткі — як правіла, каля навучальных устаноў. Гэтыя работы плануецца завяршыць да верасня. Каб дарожныя пакрыцці праслужылі даўжэй, выкарыстоўваецца тэхналогія нанясення ахоўных тонкіх пластоў. Яе прымянілі на вуліцах Кірыенкі, Адоеўскага, Кашавога, Ангарскай, Байкальскай, Русіянава, Прыграмістаў, Асаналіева, Някрасава, Лібкнехта.

Для якасці і надзейнасці пакрыцця выкарыстоўваюцца спецыяльныя асфальтабетонныя сумесі павышанай дэфармацыйнай устойлівасці. Яны лепш супрацьстаяць утварэнню каляйнасці і служаць даўжэй. Каб падоўжыць міжрамонтны тэрмін, дадаткова выконваецца павярхоўная апрацоўка ахоўнымі пластамі. Як правіла, яна праводзіцца праз некалькі гадоў пасля капітальнага рамонту вуліц ці іх участкаў. Па нарматывах міжрамонтны інтэрвал складае 6—8 гадоў. Ахоўная апрацоўка падаўжае яго ўдвая.

— Тэхналогіі, якія прымяняюцца цяпер, не новыя. Яны «прыйшлі» з вопыту і практыкі некалькі гадоў таму, але паказалі сваю эфектыўнасць, — адзначыў **начальнік упраўлення «Цэнтр» ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Руслан ЯСЮЧЭНЯ.** — У зімовы час выкарыстоўваюцца літыя асфальтабетонныя сумесі. З іх дапамогай можна рабіць рамонт пры тэмпературы да мінус 10 градусаў. Прадпрыемствы аб'яднання закупілі тэрмас-бункеры павялічанага аб'ёму. Калі раней прымянялі тэрмас-бункеры аб'ёмам да 2-3 тон, то цяпер можам перавозіць да 10 тон, што істотна змяншае затраты і павышае прадукцыйнасць.

Работы імкнуцца выконваць у начны час і выхадныя дні. Як правіла, рамонт пачынаецца вечарам пятніцы, а раніцай у панядзелак аўтамабілісты едуць па абноўленым пакрыцці.

— Працуем у кругласутачным рэжыме — з мінімальнымі нязручнасцямі для гараджан, — дадаў Руслан Ясючэня.

**Алена КРАВЕЦ.**



## Панядзелак, 21 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15, 18.45** Зона X (16+).
**9.15** Галоўны эфір.
**10.50, 12.25 Серыял «Непрыгожая сяброўка» (16+).**
**13.10, 15.15 Меладрама «Развод з перашкодамі» (12+).**
**17.35** Адзін дзень (12+).
**18.10** Гісторыі выратавання (12+).
**19.10 Меладрама «Ты мой» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.50** Зразумелая палітыка.
**22.05 Серыял «След» (16+).**
**23.55 Драма «Міністэрства» (16+).**

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**09.10** Контуры.
**10.15** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.10** «Белыя Росы» (12+).
**12.40, 13.15 Фільм «І ўсё ж я люблю...» (16+)**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** Інфармацыйны канал (16+).
**19.00** «Яшчэ не вечар» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**21.20** «Прапаганда» (16+).
**21.40 Фільм «Анёл помсты» (16+).**
**22.55 Фільм «Выпрабаванне-2» (16+).**
**0.55** «Твар у твар» (16+).

### СТБ

**6.00, 6.45, 7.45, 8.45** «Раніца СТБ».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Тыдзень».
**10.20** «Слова і справа».
**10.45 «Тры лані на алмазнай сцежцы». Серыял (12+).**
**12.15, 2.25** «Назад у СССР» (16+).
**13.50, 0.50 «Гульня. Рэванш». Серыял (16+).**
**15.25** «Дарагія таварышы» (16+).
**16.50** «Міншчына».
**17.00 «Неўскі. Паляванне на Архітэктара». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.15** «Пытанні ад бландзінак».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічны падрабязнасці».
**20.45 «Унутранае расследаванне». Серыял (16+).**
**23.20** «Азаронак. Напрамую».

### МІР

**5.00 Тэлесерыял «Чужая кроў» (16+).**
**5.25, 6.15 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў» (16+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 18.30** Навіны.
**8.40, 10.10 Маст. фільм «Залатое цяля» (16+).**
**12.30, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**13.15** «Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**16.15** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**17.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**18.50** «Мільён за 5 хвілін» (16+).
**20.15** «Гульня ў кіно» (16+).
**21.45** «Гульня ў кіно. Мультфільмы» (16+).
**22.30 Маст. фільм «Дзесяць негрыцянят» (16+).**
**1.15** Першы Еўразійскі канал (12+).
**2.15 Маст. фільм «Каханая дзяўчына» (16+).**
**3.35 Тэлесерыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу» (12+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 6.05** Галоўны эфір (12+).
